**Канстытуцыя (Асноўны Закон)**
**Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. 7 кастрычніка 1977 г.**

Арт. 6. Сілай савецкага грамадства, якая кіруе і накіроўвае, ядром яго палітычнай сістэмы, дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, з'яўляецца Камуністычная партыя Савецкага Саюза. КПСС існуе для народа і служыць народу.

...Камуністычная партыя вызначае генеральную перспектыву развіцця грамадства, лінію ўнутранай і знешняй палітыкі СССР, кіруе вялікай стваральнай дзейнасцю савецкага народа, надае планамерны навукова абгрунтаваны характар яго барацьбе за перамогу камунізму.

*Якую ролю павінна была адыгрываць КПСС у палітычнай сістэме СССР? Як вы ацэньваеце ўключэнне ў Канстытуцыю такога артыкула?*

# § 36. Палітыка перабудовы і распад СССР

*1. Чаму да пачатку 1980-х гг. СССР уступіў у паласу глыбокага эканамічнага крызісу?*
*2. З якой прычыны савецкія людзі страцілі веру ў ідэалы сацыялізму?*

Лідары СССР шчыра верылі ў тое, што капіталістычны лад асуджаны на пагібель, а будучыня — за савецкім камунізмам. Аднак іх надзеі не спраўдзіліся. Наадварот, у 1980-я гг. савецкая эканоміка пачала слабець. Рэформы, праведзеныя ў другой палове 1980-х гг. і вядомыя як «перабудова», прывялі Савецкі Саюз да аслаблення, а затым і да распаду.

**Крызіс 1980-х гг.** Да сярэдзіны 1980-х гг. у СССР усё больш прыкметнымі сталі крызісныя з'явы: спад вытворчасці, харчовыя складанасці, дэфіцыт у эканоміцы. Адміністратыўна-каманднае планавае кіраванне не магло забяспечыць далейшага развіцця эканомікі ва ўмовах НТР. СССР страчваў прыбыткі з прычыны спаду цэн на нафту і гонкі ўзбраенняў, калі канкурыраваў з высокаразвітымі індустрыяльнымі дзяржавамі, якія з'ядналіся вакол ЗША. Адчужэнне чалавека ад уласнасці, ураўноўванне ў зарплаце спараджалі незадаволенасць. Большасць людзей страцілі веру ў абвешчаныя ідэалы сацыяльнай справядлівасці на фоне росту дабрабыту многіх прадстаўнікоў улады. Пачынаючы з канца 1980-х гг. урад



Першая вялікая шахцёрская забастоўка Кузбаса. Міжрэчанск. Ліпень 1989 г.

Правообладатель Издательский центр БГУ




Чарга ў прадуктовы магазін у Маскве. Канец 1980-х гг.

шукаў выйсце з такога становішча. Перад ім стаяла альтэрнатыва: або абмежаваная палітыка тыпу нэпа, або цэнтралізаванае каманднае кіраванне з апорай на дзяржаўную ўласнасць і задушэнне прыватнай ініцыятывы.

**Перабудова і крах палітыкі М. С. Гарбачова.** У *сакавіку 1985 г.* Пленум ЦК выбраў Генеральным сакратаром КПСС ***М. С. Гарбачова***, які неаднаразова заяўляў, што імкнецца рэфармаваць неэфектыўную сістэму кіравання і эканоміку.

Курс на *«паскарэнне і перабудову»* быў замацаваны на XXVII з'ездзе КПСС. Сэнс «паскарэння» быў у тым, каб за 15 гадоў (1986—2000) пабудаваць вялікую колькасць новых прадпрыемстваў і выпусціць вялізны аб'ём прадукцыі — столькі ж, колькі было выраблена за ўсе папярэднія 70 гадоў савецкай улады.

Неўзабаве стала зразумела, што СССР не зможа рэалізаваць курс на паскарэнне. Да пачатку 1987 г. ад першапачатковага лозунга «паскарэнне і перабудова» ва ўжытку застаўся толькі другі тэрмін — ***перабудова***.

На пачатковым этапе перабудовы адбыліся значнае абнаўленне і амаладжэнне партыйных і дзяржаўных кіраўнікоў усіх узроўняў.

На прадпрыемствах уводзіліся гаспадарчы разлік, выбары дырэктараў, адраджалася кааперацыя. Адна з эканамічных праграм ставіла сабе за мэту даць кожнай савецкай сям'і асобную кватэру да 2000 г.

У краіне праводзілася палітыка *галоснасці*, якая першапачаткова азначала адкрытае асвятленне негатыўных бакоў жыцця савецкага грамадства. Пачалося пераасэнсаванне мінулага і сучаснасці. Жорстка крытыкавалася дзейнасць І. В. Сталіна і Л. І. Брэжнева.

№ 35

У знешняй палітыцы М. С. Гарбачоў імкнуўся завяршыць «халодную вайну», якая дорага каштавала. Савецкі Саюз ужо не навязваў іншым краінам сваю мадэль развіцця і пачаў імкнуцца да паляпшэння адносін з краінамі Захаду. Паміж СССР і ЗША быў падпісаны дагавор аб ліквідацыі ядзерных ракет сярэдняй далёкасці ў Еўропе. Знешняя палітыка Савецкага Саюза, які адмовіўся ад ідэі супрацьстаян-

Правообладатель Издательский центр БГУ

ня сацыялістычнай і капіталістычнай сістэм, атрымала назву *«новае палітычнае мысленне»*.

На першым этапе пераўтварэнняў было дапушчана нямала сур'ёзных памылак: размытасць мэт і стыхійнасць перабудовы, вылучэнне заведама невыканальных планаў, празмернае ачарненне гістарычнага мінулага, грэбаванне нацыянальнымі інтарэсамі, каб дагадзіць заходнім краінам.

У 1988 г. пачаўся крызіс перабудовы. Яго паказчыкам перш за ўсё стала адсутнасць еднасці ў вышэйшым кіраўніцтве партыі і дзяржавы. Звальненне з пасады і цкаванне ў 1987—1988 гг. аднаго з партыйных кіраўнікоў Б. М. Ельцына садзейнічалі яго папулярнасці сярод апазіцыйных лідараў.

Літаральна на вачах КПСС страчвала свой аўтарытэт. Міжнацыянальныя канфлікты прывялі да беспарадкаў у 1986 г. у Казахстане, хваляванняў у Прыбалтыцы ў 1987 г., узброеных сутыкненняў паміж армянамі і азербайджанцамі ў Сумгаіце ў 1988 г. Трагічным сімвалам крызісу стала аварыя ***26 красавіка 1986 г.*** на *Чарнобыльскай АЭС*.

Пераломнай падзеяй перабудовы стала *XIX Усесаюзная партыйная канферэнцыя*, праведзеная *28 чэрвеня — 1 ліпеня 1988 г.*, якая мела на мэце знайсці выйсце з крызісу. Партканферэнцыя прыняла рашэнне аб правядзенні палітычнай рэформы ў СССР. Асноўны змест гэтай рэформы быў у тым, каб ператварыць Саветы ў рэальныя органы ўлады, заснаваць новы палітычны орган — З'езд народных дэпутатаў СССР, правесці выбары З'езда народных дэпутатаў СССР, з'ездаў Вярхоўных Саветаў саюзных рэспублік і іншых Саветаў усіх узроўняў на дэмакратычнай аснове.

**Рэформа палітычнай сістэмы і яе наступствы.** *I З'езд народных дэпутатаў СССР* адбыўся 25 мая — 9 чэрвеня 1989 г. Са свайго складу З'езд сфарміраваў Вярхоўны Савет СССР, які працаваў пастаянна. Старшынёй Вярхоўнага Савета СССР быў абраны М. С. Гарбачоў. Упершыню ў гісторыі СССР была створана парламенцкая апазіцыя (кіраўнікі — Б. М. Ельцын, акадэмік А. Д. Сахараў і інш.), якая выступіла з крытыкай КПСС і савецкага ладу. Пасля заснавання З'езда народных дэпутатаў, які ператварыўся ў новы цэнтр улады, значнасць вышэйшых партыйных органаў КПСС пачала зніжацца.



А. Д. Сахараў выступае на I З'ездзе народных дэпутатаў СССР. Масква. 1989 г.

У той жа час СССР усё часцей рабіў аднабаковыя ўступкі заходнім краінам. У 1989 г. савецкія войскі былі поўнасцю

Правообладатель Издательский центр БГУ



Вывад савецкіх войскаў з Афганістана. 1989 г.

выведзены з Афганістана. Са згоды СССР была аб'яднана Германія. Затым савецкае кіраўніцтва пагадзілася вывесці свае войскі з аб'яднанай Германіі, якая ўступала ў НАТА. СССР заняў пазіцыю неўмяшання ў працэсы, якія прывялі да падзення сацыялістычных рэжымаў і ўлады кампартый у сацкраінах. У ***1991 г.*** былі распушчаны СЭУ і АВД без усялякіх крокаў у адказ з боку Паўночнаатлантычнага блока.

Непаслядоўнасць і нерашучасць М. С. Гарбачова прывялі да фарміравання новага радыкальнага палітычнага напрамку. Яго сімвалам стаў Б. М. Ельцын, які выступіў з крытыкай найвышэйшага кіраўніцтва КПСС і за павышэнне ролі Саветаў. Пачалася барацьба за ўладу паміж Гарбачовым і Ельцыным. М. С. Гарбачоў паспрабаваў умацаваць свае пазіцыі і ў *1990 г.* стаў Прэзідэнтам СССР.

У той жа час у саюзных рэспубліках узмацніліся нацыяналістычныя настроі, узніклі экстрэмісцкія групоўкі. Тэрытарыяльныя і этнічныя праблемы прывялі да абвастрэння нацыянальных канфліктаў, якія асабліва моцна праявіліся ў Нагорным Карабаху, Малдове, Абхазіі, Ферганскай вобласці і інш. Спрабуючы ўратаваць СССР, Гарбачоў адначасова выступіў з ініцыятывай стварэння новага Саюзнага дагавора і дэманстраваў сілавы падыход. У 1990—1991 гг. у Ерэван, Баку, Тбілісі, Вільнюс былі ўведзены войскі.

У адказ пачаўся «парад суверэнітэтаў», г. зн. прыняцце Вярхоўнымі Саветамі рэспублік дэкларацый аб незалежнасці. Масква пачала эканамічную блакаду, што не раз'яднала, а яшчэ больш з'яднала людзей. Такім чынам, у СССР пачалася барацьба паміж цэнтрам і саюзнымі рэспублікамі.

*Складзіце храналогію прыняцця саюзнымі рэспублікамі дэкларацый аб суверэнітэце.*

**Жнівеньскі палітычны крызіс 1991 г. і распад СССР.** Каб выратаваць сваю ўладу і захаваць СССР, М. С. Гарбачоў *17 сакавіка 1991 г.* правёў рэферэндум, у ходзе якога за існаванне абноўленага (федэратыўнага) СССР выказалася каля 80 % удзельнікаў галасавання. У мэтах выканання гэтага рашэння да 20 жніўня быў падрыхтаваны новы Саюзны дагавор.

Нечакана 19 жніўня ў Маскве кансерватыўна настроеныя найвышэйшыя чыноўнікі з асяроддзя Гарбачова заявілі ў яго адсутнасць аб стварэнні *Дзяржаўнага камітэта па надзвычайным становішчы (ДКНС)* у мэтах аднаўлення старога парадку. У Маскву былі ўведзены войскі. Аднак абурэнне «путчам» у Маскве і саюзных рэспубліках прывяло да арышту членаў Дзяржаўнага камітэта па надзвычайным становішчы.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Выступленне Б. М. Ельцына перад дэманстрантамі ў час жнівеньскага палітычнага крызісу 1991 г.

М. С. Гарбачоў, які вярнуўся ў сталіцу, спрабуючы выратаваць свой аўтарытэт, адмовіўся ад пасады Генеральнага сакратара ЦК КПСС. Ініцыятыва перайшла да Б. М. Ельцына. У гэты час кіраўнікі саюзных рэспублік, якія былі напалоханы непрадказальнасцю Масквы і не жадалі ўпускаць уладу, вырашылі замацаваць незалежнасць.

8 снежня ***1991 г.*** лідары Расіі, Украіны і Беларусі Б. М. Ельцын, Л. М. Краўчук і С. С. Шушкевіч абвясцілі роспуск СССР і стварэнне *Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД)*. *21 снежня* да іх далучыліся кіраўнікі яшчэ васьмі рэспублік (Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Таджыкістана, Туркменістана і Узбекістана).

25 снежня 1991 г. Гарбачоў склаў паўнамоцтвы Прэзідэнта СССР. Савецкая дзяржава спыніла сваё існаванне.

1. Якія задачы ставіў М. С. Гарбачоў, пачынаючы перабудову у СССР? Растлумачце, чаму рэфармаванне грамадства ў СССР пачалося «зверху».
2. У чым была супярэчлівасць правядзення эканамічных рэформаў? Якім быў іх вынік?
3. Што прадугледжвала дэмакратызацыя палітычнай сістэмы ў СССР? Раскажыце пра яе вынікі.
4. Якія змены адбыліся ў сістэме дзяржаўнага ўладкавання СССР у гады перабудовы?
5. Чаму перабудовачныя працэсы вы́клікалі абвастрэнне нацыянальнага пытання?
6. Сфармулюйце прычыны, якія прывялі да распаду СССР.
7. Якая новая палітычная канцэпцыя была выпрацавана М. С. Гарбачовым у галіне знешняй палітыкі СССР? Прывядзіце прыклады яе рэалізацыі. Як змянілася пазіцыя СССР на міжнароднай арэне?
8. Параўнайце мэты, якія ставіў М. С. Гарбачоў, пачынаючы перабудову, і яе вынікі. Чаму перабудовачныя працэсы набылі бескантрольны, незваротны характар?

Грамадства «развітога сацыялізму» мела шэраг негатыўных праяў. Тым не менш значная частка насельніцтва былога Савецкага Саюза са шкадаваннем згадвае тыя часы. Высветліце, з чым гэта звязана. Правядзіце апытанне сярод прадстаўнікоў старэйшага пакалення. Якое іх стаўленне да хрушчоўскай «адлігі», брэжнеўскага «застою», гарбачоўскай перабудовы?

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Міхаіл Сяргеевіч Гарбачоў** (нар. 1931) — расійскі палітычны і дзяржаўны дзеяч, першы і адзіны Прэзідэнт СССР (1990—1991). Працоўную дзейнасць пачаў з 15 гадоў механізатарам МТС. Скончыў юрыдычны факультэт МДУ. Затым перайшоў на камсамольскую, а пасля на партыйную працу. У 1970 г. стаў самым маладым першым сакратаром райкама партыі і праз год быў абраны ў склад ЦК КПСС. Вылучаўся мэтанакіраванасцю, напорыстасцю, высокай працаздольнасцю. У 1980 г. стаў самым маладым членам Палітбюро. У сакавіку 1985 г. быў аднагалосна выбраны Генеральным сакратаром ЦК і пачаў перабудову. Удастоены Нобелеўскай прэміі міру «ў знак прызнання яго істотнай ролі ў мірным працэсе» (1990).



## § 37. Расійская Федэрацыя

*1. Якія перыяд гісторыі СССР называюць перабудовай? 2. Калі была ўтворана Садружнасць Незалежных Дзяржаў?*

РСФСР, найбуйнейшая па тэрыторыі і колькасці насельніцтва рэспубліка, дамінавала ў СССР. Аднак уласнай дзяржаўнасці ў савецкі перыяд яна фактычна не мела. Палітыка перабудовы прывяла да распаду СССР, стварэння на яго тэрыторыі незалежных дзяржаў, у тым ліку Расійскай Федэрацыі.

**Расія на шляху да суверэнітэту.** Працэс палітычнага рэфармавання РСФСР пачаўся пасля выбараў народных дэпутатаў у сакавіку 1990 г. У выніку гэтых выбараў каля паловы дэпутацкіх месцаў атрымалі прадстаўнікі дэмакратычных сіл, лідарам якіх стаў былы першы сакратар Маскоўскага гаркама КПСС Б. М. Ельцын. У маі 1990 г. ён быў абраны старшынёй Вярхоўнага Савета РСФСР.



Інаўгурацыя Прэзідэнта РСФСР Б. М. Ельцына. 1991 г.

Важнымі крокамі на шляху пабудовы новай дзяржаўнасці сталі прыняцце *Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце РСФСР*, якое адбылося *12 чэрвеня 1990 г.*, і ўвядзенне пасады прэзідэнта РСФСР, які выбіраўся ўсенародна. Уся паўната суверэнітэту цяпер належала Расіі ў асобе яе найвышэйшых дзяржаўных органаў. Першым Прэзідэнтам РСФСР *12 чэрвеня 1991 г.* быў абраны Б. М. Ельцын. Расія

Правообладатель Издательский центр БГУ